# ДУА «Чудзінская сярэдняя школа»
# Ганцавіцкага раёна

Школа Активного Гражданина

***Інфармацыйна-адукацыйны праект «Школа Актыўнага Грамадзяніна» для навучэнцаў VIII-XI класаў 26.02.2021***

***Інфармацыйная гадзіна “Беларусь і Расія: гісторыя станаўлення і развіцця Саюзнай дзяржавы” (да дня яднанняў народаў Беларусі і Расіі)***

**Мэта:** *пазнаёміць навучэнцаў з гісторыяй станаўлення Саюзнай дзяржавы, аспектамі маладзёжнай палітыкі; дапамагчы старшакласнікам усвядоміць, што будучае Саюзнай дзяржавы – у руках моладзі і для моладзі.*

У рамках адзінага дня інфармавання ў ДУА “Чудзінская сярэдняя школа” адбылося сёмае пасяджэнне школы актыўнага грамадзяніна на тэму “Беларусь і Расія: гісторыя станаўлення і развіцця Саюзнай дзяржавы”. Беларуска-расійскае братэрства прайшло выпрабаванне часам. Разам нашы народы перамаглі фашызм, разам аднаўлялі разбураную вайной эканоміку, разам будуюць Саюзную дзяржаву. Пачатак інтэграцыі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі як двух суверэнных дзяржаў быў пакладзены 2 красавіка 1996 года, калі Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка і першы Прэзідэнт Расіі Барыс Мікалаевіч Ельцын падпісалі Дагавор аб Садружнасці Беларусі і Расіі.




Мэта яднання дзвюх дзяржаў – эканамічнае, палітычнае, культурнае супрацоўніцтва. Менавіта з гэтай важнай інфармацыі пачалася сустрэча за круглым сталом для вучняў 8-11 класаў разам з начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Супруном Віктарам Міхайлавічам. На працягу сустрэчы ішла зацікаўленая размова аб гісторыі станаўлення Саюзнай дзяржавы, сумесных маладзёжных праектах Беларусі і Расіі. Асаблівую цікавасць вучняў выклікалі праекты “Лічбавая зорка”, “Экалогія без межаў”, “Саюзная дзяржава – маладым талентам 21 стагоддзя”. Віктар Міхайлавіч падкрэсліў,






што будчыня Саюзнай дзяржавы – у руках моладзі. Адказваючы на шматлікія пытанні старшакласнікаў, госць адзначыў тыя якасці, якімі павінен валодаць сучасны малады чалавек: быць патрыётам сваёй Радзімы, займаць актыўную грамадзянскую пазіцыю, быць камунікатыўным і, канешне, валодаць сучаснымі інфармацыйнымі тэхналогіямі. Але рабяты ў асобе Віктара Міхайлавіча ўбачылі не толькі галоўнага ідэолага раёна, які ў курсе ўсіх палітычных, культурных падзей, але і добрага сем’яніна, клапатлівага бацьку і проста мудрага чалавека.

У канцы сустрэчы ўдзельнікі ШАГа прыйшлі да высновы, што Саюзная дзяржава развіваецца на аснове гістарычнай і духоўнай агульнасці двух народаў. Беларусь і Расія – дзве сястры, якія ідуць побач рука аб руку не адно дзесяцігоддзе. Задача сучаснай моладзі – прыняць эстафету ў старэйшага паклення і, выкарыстоўваючы свой патэнцыял, новыя падыходы да рэалізацыі маладзёжнай палітыкі, імкнуцца да ўмацавання і ўдасканалення саюзнай дзяржавы.

*І.А. Валодзька, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ДУА «Чудзінская сярэдняя школа»*
*Брэсцкая вобласць, Ганцавіцкі раён аг.Чудзін, вул.Савецкая, 149Б*
*Кантактны тэлефон: 8-01646-51 238 80333010754*
*E-mail: chudin@gancevichi.edu.by*